*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

**Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна**

№ 8 (353) | Субота, 21 лютага 1959 года | Цана 20 кап.

## Праграмны дакумент для навуковай работы

Гістарычны XXI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза акрэсліў велічную праграму разгорнутага будаўніцтва камунізма ў нашай краіне. З'езд канстатаваў велічныя поспехі, дасягнутыя савецкім народам у вобласці гаспадарчага будаўніцтва, навукі і тэхнікі. У выніку натхнёнай працы наша краіна пераадолела спрадвечную адсталасць, ператварылася ў магутную індустрыяльна-калгасную дзяржаву. Савецкі народ ганарыцца дасягненнямі нашых вучоных, якія ўнеслі вялікі ўклад у сусветную навуку.

У адказ на клопаты любімай партыі савецкія вучоныя, інжынеры і тэхнікі, рабочыя і калгаснікі, кожны на сваім пасту, працуюць з неаслабнай энергіяй.

Навука заклікана вырашаць важнейшыя задачы камуністычнага будаўніцтва. «Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, — гаварыў М. С. Хрушчоў на XXI з'ездзе КПСС, — патрабуе росквіту навукі, актыўнага ўдзелу вучоных у вырашэнні праблем, звязаных з далейшым усебаковым развіццём прадукцыйных сіл нашай краіны».

Для нас, аспірантаў, якія рашылі прысвяціць сябе навуковай рабоце, рашэнні з'езда адкрываюць велічныя перспектывы і з'яўляюцца праграмным дакументам у навукова-даследчай рабоце. Кожны з нас, выбіраючы тэму сваёй будучай даследчай работы, павінен кіравацца тым, якое практычнае значэнне будзе яна мець.

Тэма маёй работы, якая ўжо зацверджана кафедрай эканамічнай геаграфіі,—«Хімічная прамысловасць Беларусі і перспектывы яе развіцця». ЦК партыі ў сваіх рашэннях, асабліва на майскім Пленуме і XXI з'ездзе, неаднаразова ўказваў на неабходнасць усямернага развіцця хімічнай прамысловасці, а таксама на вывучэнне законамернасцей рацыянальнага размяшчэння яе галін на тэрыторыі краіны.

Надзвычай важнае значэнне мае развіццё хіміі ў Беларусі, дзе на працягу сямі год будуць створаны новыя галіны хімічнай прамысловасці, якія будуць працаваць на прыродным газе, нафце. Задача спецыялістаў-географаў — аказаць дапамогу практычным работнікам у правільным размяшчэнні галін прамысловасці, сельскай гаспадаркі і найбольш рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў.

Мы, аспіранты, прыкладзём усе свае сілы, каб унесці пасільны ўклад у справу ажыццяўлення рашэнняў XXI з'езда КПСС.

**В. ШАПЛЫКА,**
аспірант, кандыдат у члены КПСС.

## Пачэсная справа гідрабіёлагаў

Сярод многіх рашэнняў XXI з'езд КПСС, акрэсліўшы велізарную праграму пабудовы камунізма, намечана павялічыць да 1965 году ўлоў рыбы на 60 працэнтаў, што павінна быць дасягнута не толькі шляхам павелічэння марскога ўлову, але таксама, як адзначана ў рэзалюцыі з'езда, шляхам лепшага выкарыстання рыбапрадуктыўнасці азёр, уноў будуемых водасховішч і другіх унутраных вадаёмаў.

Вялікая роля ў рашэнні гэтай задачы адводзіцца біялагічнай навуцы. Біёлагі нашага універсітэта маюць многа матэрыялаў па біялагічнай прадуктыўнасці буйных прамысловых вадаёмаў — нарачанскіх азёр. Гэта дае магчымасць скласці разам з беларускім Інстытутам рыбнай гаспадаркі план арганізацыі рацыянальнай рыбнай гаспадаркі на гэтых азёрах. Гэта сумесная тэма ўключана ў план навуковай работы на 1959 года і, як мы спадзяемся, дасць магчымасць паказаць практычны вынік нашых даследванняў.

**Г. Г. ВІНБЕРГ,** прафесар.

## У НАС НА АГІТПУНКЦЕ

Больш месяца мінула з таго часу, як апублікаваны Указ аб правядзенні выбараў у Вярхоўны Савет БССР і ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

За гэты час агітпункт выбарчага ўчастка № 19 правеў значную работу.

Шмат папрацавалі агітбрыгады над тым, каб скласці новы спіс выбаршчыкаў, таму што на нашым участку адбыліся змены, звязаныя з засяленнем новага вялікага дома. Асабліва добра папрацавалі студэнты III курса юрыдычнага факультэта Бохан, Шворава, Грамовіч і многія іншыя.

Намечаныя агітпунктам масавыя мерапрыемствы з выбаршчыкамі праводзяцца строга па плану. З цікавасцю праслухалі выбаршчыкі лекцыю дацэнта Левіна аб міжнародным становішчы, даклад дацэнта Тамашэвіча аб сямігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР, з задавальненнем праглядзелі кінафільм. Добра прайшоў вечар пытанняў і адказаў на юрыдычныя тэмы.

На жаль, не ўсе агітбрыгады зразумелі важнасць даручанай ім справы і, спасылаючыся на аб'ектыўныя прычыны (экзамены, канікулы), спрабуюць апраўдаць сваю нездавальняючую работу з выбаршчыкамі. У прыватнасці, не зусім сур'ёзна адносяцца да свайго грамадскага абавязку агітатары філалагічнага факультэта (адказная тав. Глінская). Яны не ўсе нават наведваюць нарады агітатараў.

Да 1 сакавіка застаўся адзін тыдзень. Ужо зарэгістраваны кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Савета рэспублікі і ў мясцовыя Саветы. Гэта ставіць перад агітатарамі новыя задачы. Неабходна пазнаёміць выбаршчыкаў з кандыдатамі, за якіх яны будуць галасаваць, арганізаваць вечары сустрэч з імі.

**Е. БАБІЦКІ,**
загадчык агіткалектыва.
**Д. МЕЛЬЦАР,**
загадчык агітпункта.

## НАШЫ КАНДЫДАТЫ



Загадчык кафедрай неарганічнай хіміі акадэмік АН БССР **М. Ф. ЯРМОЛЕНКА.**

*Хто не ведае Мікалая Фёдаравіча Ярмоленку, старэйшага беларускага вучонага! Нарадзіўся ён у вёсцы Клюпаўка, Багушэўскага раёна, Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. У лістападзе 1924 года пачаў працаваць у Беларускім дзяржаўным універсітэце пры кафедры неарганічнай хіміі ў якасці асістэнта. У 1928 годзе яго накіроўваюць на год у Германію ў інстытут калоіднай хіміі Лейпцыгскага універсітэта.*

*Яго станаўленне як вучонага адбывалася разам са станаўленнем Беларускага універсітэта, у якім ён пачаў працаваць. Вось Мікалай Фёдаравіч кандыдат навук, затым дацэнт, вось абараняе доктарскую дысертацыю, а неўзабаве яго выбіраюць членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР.*

*У час вайны М. Ф. Ярмоленка эвакуіраваўся ў Сталінград. Працуючы ў інстытуце, ён арганізоўвае групу па праверцы працівагазаў, дапамагае ў грамадскай рабоце. Пасля эвакуацыі са Сталінграда навуковых устаноў вяртаецца ў Акадэмію навук БССР, якая ў гэты час знаходзілася ў Ташкенце. Хутка нястрымна пагнала ворага з родных зямель Савецкая Армія. З восені 1943 года на станцыі Сходня, пад Масквой, аднавіў работу Беларускі дзяржаўны універсітэт. У хуткім часе Мікалай Фёдаравіч быў у ліку яго супрацоўнікаў. А калі Мінск быў вызвалены, калі адсвяткавалі перамогу, мы бачым тав. Ярмоленку ў зруйнаванай ворагамі сталіцы Беларусі. І да гэтага часу ён працуе тут. Імя Ярмоленкі з вялікай любоў'ю і павагай вымаўляюць у Акадэміі і ва універсітэце. За час сваёй навуковай дзейнасці ён апублікаваў каля 170 навуковых прац, толькі за пасляваенныя гады падрыхтаваў 6 кандыдатаў навук.*

*Пасляваенны перыяд характэрны значным пашырэннем творчага дыяпазону вучонага. Ён настойліва працуе разам з навуковымі супрацоўнікамі інстытута хіміі і інжынерамі над многімі праблемамі вытворчасці.*

*Мікалай Фёдаравіч вядзе вялікую грамадскую работу— ён дэпутат Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных трох скліканняў, а таксама член бюро хімічнай секцыі рэспубліканскага таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў.*

*За выдатныя заслугі ў развіцці хімічнай навукі Мікалай Фёдаравіч узнагароджаны ордэнам Леніна і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а ў 1951 годзе яму было прысвоена званне заслужанага дзеяча навук БССР.*

*Такі шлях вучонага-акадэміка, заслужанага дзеяча навукі і чалавека-камуніста, які заўсёды з людзьмі, з народам, з партыяй.*

Н. БОКАЧ.

## Агітатар ідзе да выбаршчыка

Яшчэ і зараз працягваецца засяленне шматкватэрнага дома (праспект імя Сталіна, 29), які будаўнікі здалі ў эксплуатацыю датэрмінова ў гонар 40-годдзя БССР. Тут амаль кожны дзень ёсць якія-небудзь змены ў колькасці жыхароў.

Гэта патрабуе ад агітатараў асаблівай аператыўнасці, амаль штодзённага наведвання выбаршчыкаў.

І вось для чарговай сустрэчы з выбаршчыкамі, якія ўпершыню будуць галасаваць па 19 выбарчаму ўчастку, адправіліся студэнты-агітатары.

Шыловіч і Ляхаў заходзяць у кватэру, дзе ў мінулы раз яшчэ не было жыхароў. Ім адным з першых і прышлося павіншаваць з наваселлем пенсіянера, Героя Сацыялістычнай Працы. Як дарагіх гасцей прыняў агітатараў Васіль Андрэевіч. Адразу завязалася размова.

—Мяне і маю сям'ю агітаваць не трэба. У дзень выбараў мы ў ліку першых аддамо свае галасы за кандыдатаў народа. Я і сам бачу, як пад мудрым кіраўніцтвам партыі і ўрада з году ў год, ад выбараў да выбараў мяняецца аблічча нашай роднай Беларусі. А вось, калі ласка, раскажыце пра жыццёвы шлях і дзейнасць кандыдатаў, якія балатыруюцца па нашай выбарчай акрузе ў Вярхоўны і мясцовыя Саветы.

Шыловіч і Ляхаў падрабязна расказваюць пра кандыдатаў народа. Уносяць змены і папраўкі ў спіскі выбаршчыкаў, дамаўляюцца аб наступнай сустрэчы.

Доўга зацягваюцца размовы ў 39 кватэры. Жыхароў яе, і асабліва Людмілу Сяргееўну Палякову, цікавяць усе пытанні: і рашэнні XXI з'езда КПСС, і ўнутраная і знешняя палітыка Савецкага Саюза, і навіны міжнароднага жыцця.

—Якое ў вас застаецца ўражанне аб нашых агітатарах?— спыталі мы ў Людмілы Сяргееўны.

—Вельмі і вельмі добрае. Мы задаволены іх грунтоўнымі адказамі на нашы пытанні. Малайцы рэбяты. Ну і мы сустракаем іх як дарагіх гасцей.

Частымі гасцямі ў выбаршчыкаў з'яўляюцца агітатары Кітаеў, Астрэйка, Бяспалы, Казявін і іншыя. Яны робяць усё, каб выбаршчыкі актыўна ўдзельнічалі ў масавай рабоце, якую праводзіць агіткалектыў.




На здымку: у агітпункце гуманітарнага корпуса вечарам.

Фота Г. ПРАВАЛОВ А

